УДК 39-053.2

# Роля традыцыйнага дзіцячага адзення беларусаў у забеспячэнні здароўя

Якубінская А.Дз.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Галоўная функцыя адзення – стварыць чалавеку прыдатныя ўмовы для існавання ў навакольным асяроддзі і грамадстве. Адзенне адыгрывае значную ролю ў забеспячэнні здароўя чалавека, ахоўваючы яго ад негатыўных уплываў навакольнага асяроддзя, а ў дачыненні да дзяцей садзейнічае фарміраванню іх правільнага і дасканалага фізічнага вобліку. Спецыфіка дзіцячага адзення беларусаў другой паловы XIX–першай паловы XX ст. асабліва прасочваецца ў дачыненні да вопраткі дзяцей малодшага ўзросту (ад нараджэння да аднаго году). Першай вопраткай немаўляці з'яўляецца «мятлік» – кавалак мяккай тканіны, у цэнтры якога быў разрэз для галавы. У свядомасці беларусаў мятлік меў ахоўны сэнс для жыцця і здароўя дзіцяці, бо яго паходжанне генетычна звязана з так званай «сарочкай» (калаплодным пузыром). Яго апраналі на дзіця да 4–6 месяцаў, адначасова загортвалі немаўля ў «пялюшкі» («полкі»). Звычайна для немаўляці бралі 3 пялюшкі: адну для галавы («пагалоўнік»), другую для таза – «падгузнік», трэцюю – для загортвання ўсяго цела. Даўней казалі: «Як будзеш дзіця туга спавіваць, то ручкі будуць крэпкія, ножкі будуць простыя (роўныя)». Менавіта тугое спавіванне па меркаванні сялянак садзейнічала прафільнаму фарміраванню дзіцячага цела. Апошні этап – звязванне дзіцяці «спавівачом» – тугім поясам, які звычайна абгортваў цела дзіцяці крыж-накрыж некалькі разоў. Семіятычны сэнс пояса заключаецца ў наступным: пояс не толькі вызначаў далучэнне новага чалавека да свету людзей, далейшае яго нашэнне было абавязковым з-за яго ахоўных функцый. Спавівалі дзіця звычайна прыкладна да шасці месяцаў, у гэтым узросце дзецям незалежна ад полу пачыналі апранаць ільняныя сарочкі. Цяпер дзяўчынку падвязвалі поясам на таліі або вышэй пад грудзьмі, а хлопчык насіў пояс амаль на сцёгнах, як дарослы мужчына. Калі дзіця падрастала прыкладна да шасці тыдняў і магло трымаць галоўку самастойна, пагалоўнік замянялі «чэпчыкам» («тулячкай»). Такім чынам, беларускія сялянкі імкнуліся забяспечыць дзіцяці найбольш прыдатныя ўмовы для здаровага ладу жыцця, улічваючы асаблівасці развіцця дзіцячага арганізма і адзенне адыгрывала істотную ролю ў забеспячэнні здароўя немаўлят.